УДК 026.072

# АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ ШКОЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ЧЫТАЦКАЙ САМАСТОЙНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ (З ВОПЫТУ РАБОТЫ ДУА “СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА № 23 г. МАГІЛЁВА”)

***А. Ф. Гарачая*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д. А. Доўгаль***, дацэнт

Праблема дзіцячага чытання хвалюе педагогаў, бібліятэкараў і грамадскасць у многіх краінах свету. Школьная бібліятэка – гэта ўнікальны асяродак для сацыякультурнага, кагнітыўнага і камунікатыўнага развіцця асобы сродкамі сусветных культур.

Асноўнымі кірункамі дзейнасці школьнай бібліятэкі ДУА “Сярэдняя школа № 23 г. Магілёва” для развіцця чытацкай самастойнасці малодшых школьнікаўз’яўляюцца наступныя:

– забеспячэнне навучальнага і выхаваўчага працэсу ўсімі формамі і метадамі бібліятэчнага і інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання;

– прывіццё любові да кнігі і выхаванне культуры чытання, беражлівага стаўлення да друкаваных выданняў;

– прыцягненне кожнага выхаванца да сістэматычнага чытання з мэтай паспяховага вывучэння школьных прадметаў, развіцця маўлення і мыслення, пазнавальных інтарэсаў, творчых здольнасцей і духоўнага выхавання [1, с. 24].

Па кожным з адзначаных кірункаў дзейнасці ў рабоце школьнай бібліятэкі выкарыстоўваюцца розныя формы і метады: выставы юбілейных і знамянальных дат; рэкамендацыйныя гутаркі пры выдачы кніг; тыдні дзіцячай кнігі, дні роднай мовы, падарожжы па Чытай-Горадзе; інтэрактыўныя гульні, флэш-гульні па казках, гадзіны чытання “Бібліятэрапія”; практыкуецца выкарыстанне прайгравальніка для праслухоўвання казак і іншых твораў у выкананні артыстаў; праводзяцца анлайн-канферэнцыі з цікавымі людзьмі і сучаснымі пісьменнікамі; сумесныя мерапрыемствы з бацькамі і інш.

Усе мерапрыемствы, якія праводзіліся бібліятэкай, былі накіраваны на літаратурную, гістарычную, талерантную асвету малодшых школьнікаў.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што авалоданне малодшымі школьнікамі ўсімі бакамі чытацкай самастойнасці – складаны працэс, які патрабуе спецыяльнай мэтанакіраванай работы бібліятэкара, настаўніка і бацькоў.

**Літаратура**

1. Гарачая, А. Выхаваць гарманічную духоўна-маральную асобу / А. Гарачая // Бібліятэка прапануе. – 2018. – № 1. – С. 23–24.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова